УДК: 94(476)»1861/1862»:930

# ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ МАНІФЕСТАЦЫЙНАГА ПЕРЫЯДУ 1861–1862 гг. У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***Д. У. Лішай***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,* lishaiy-d96@yandex. ru
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі,*
*вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь,* lishaiy-d96@yandex. ru

Разглядаецца сучасны стан даследавання маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. Аналізуюцца дасягненні беларускай і замежнай гістарыяграфій. Акцэнтуецца ўвага на актуальнасці заяўленай тэмы для сучаснай айчыннай гістарычнай навукі.

***Ключавыя словы:*** сучасная беларуская гістарыяграфія; маніфестацыйны перыяд 1861–1862; тэрміналагічны аспект; перыядызацыя падзей; сацыяльна-колькасны склад; рэгіянальная спецыфіка.

# ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ ИССЛЕДОВАНИЯ МАНИФЕСТАЦИОННОГО ПЕРИОДА 1861–1862 гг. В СОВРЕМЕННОЙ БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ

***Д. В. Лишай***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex. ru*
*Институт истории НАН Беларуси,*
*ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex. ru*

Рассматривается современное состояние исследования манифестационного периода 1861–1862 гг. Анализируются достижения белорусской и зарубежной историографий. Акцентируется внимание на актуальности заявленной темы для современной отечественной исторической науки.

***Ключевые слова:*** современная белорусская историография; манифестационный период 1861–1862; терминологический аспект; периодизация событий; социально-количественный состав; региональная специфика.

# PROBLEMS AND PROSPECTS OF THE STUDY OF THE DEMONSTRATION PERIOD OF 1861–1862 IN CONTEMPORARY BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY

***D. V. Lishai***

*Belarusian State University,*
*4, Niezaliežnasci Avenue, 220030, Minsk, Republic of Belarus,* lishaiy-d96@yandex. ru
*Institute of History of the NAS of Belarus,*
*1, Akademicheskay Street, 220072, Minsk, Republic of Belarus,* lishaiy-d96@yandex. ru

The article analyses the main issues of the demonstration period of 1861-1862 that have been examined by Belarusian and foreign scholars. The relevance of the subject to contemporary national historiography is highlighted. Potential for a comprehensive study of this scientific problem is identified.

***Key words:*** contemporary Belarusian historiography; demonstration period 1861–1862; terminological issue; periodization of events; socio-quantitative composition; regional specificity.

Сучасная беларуская гістарыяграфія разглядае шэраг актуальных навуковых праблем. Адным з прыярытэтных напрамкаў вывучэння застаецца грамадска-палітычнае жыццё Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. У межах гэтай тэмы актуальным прадметам даследавання з’яўляецца маніфестацыйны перыяд 1861–1862 гг. – час антыўрадавых хваляванняў сярод мясцовага насельніцтва на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, які папярэднічаў узброенаму паўстанню 1863–1864 гг. За вялікі грамадскі рэзананс гісторык М. Дубецкі называў яго «маральнай рэвалюцыяй» [23, s. 2], а С. Кяневіч – «Лютаўскай рэвалюцыяй» [26, s. 8]. Значэнне згаданага перыяду пацвярджаецца фактамі яго ўключэння расійскімі ўладамі ў перыядызацыю паўстання 1863–1864 гг. Так, у фондзе 320 «Мінскі губернскі прадвадзіцель дваранства» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваюцца справы № 129 і № 132, у якіх прыводзяцца «імёны ўдзельнікаў паўстання 1861–1863 гг.» [9–10]. Нягледзячы на прадстаўленыя ацэнкі, гэта тэма яшчэ патрабуе комплекснага навуковага даследавання.

Першыя спробы асэнсавання антыўрадавага руху пачатку 60-х гг. XIX ст. у айчыннай гістарыяграфіі былі зроблены яшчэ ў міжваенны час. Так, у працах У. М. Ігнатоўскага [5, с. 43–100], С. Г. Цытовіча [19, с. 388–412], якія прысвячаліся паўстанню 1863–1864 гг., разглядаліся такія аспекты тэмы, як агульная характарыстыка маніфестацый, сацыяльны склад удзельнікаў хваляванняў, формы пратэстных выступленняў.

Савецкая гістарычная навука паказвала маніфестацыйны перыяд 1861–1862 гг. на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў як падрыхтоўчы этап паўстання 1863–1864 гг. Аналіз і тэарэтычнае абгрунтаванне гэтай з’явы асвятлялася ў даследаваннях А. Ф. Смірнова [16, с. 53–73; 17, с. 460–480], М. В. Міско [8, с. 53–79].

У польскай гістарыяграфіі маніфестацыйнаму перыяду 1861–1862 гг. таксама надвалася належная ўвага. Адметна, што акрамя разгляду падзей гэтага этапу ў Царстве Польскім даследчыкі звярнуліся да працэсаў, што адбываліся ў беларуска-літоўскіх губернях. Так, касцёльныя маніфестацыі, асаблівасці антыўрадавай агітацыі, асобныя аспекты дзейнасці тайных

паўстанцкіх арганізацый, адметнасці дваранскай апазіцыі адлюстроўвалі Д. Файнгаўз [24, s. 31–57], С. Ланец [29, s. 26–28; 30, s. 32–38; 31, s. 11–15; 32, s. 23–30].

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі да маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. звярталіся айчынныя гісторыкі В. С. Касмылёў [6, с. 51–53], А. Э. Сакольчык (Фірыновіч) [13, с. 227–229; 14, с. 46–51; 15, с. 301–321; 18, с. 184–187], В. В. Швед [20, с. 78–97; 21, с. 140–152], С. Я. Глазырын [2, с. 11–17; 3, с. 35–41], Д. Ч. Матвейчык [7, с. 8–18], А. Л. Радзюк [11, 110–139], В. В. Яноўская [22, с. 256–266], В. У. Герасімчык [1, с. 74–158].

Адным з галоўных пытанняў тэмы застаецца тэрміналагічны аспект. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў дачыненні да грамадскіх хваляванняў 1861–1862 гг., якія папярэднічалі паўстанню 1863–1864 гг., выкарыстоўваюцца наступныя вызначэнні: «маніфестацыйны перыяд», «перыяд маніфестацый», «маніфестацыйны этап паўстання», «перадпаўстанцкі перыяд», «маніфестацыйны рух», «антыўрадавы рух», «рэвалюцыйная сітуацыя» [1, с. 74, 91; 2, с. 15–16; 3, с. 35; 7, с. 9–13; 14, с. 46; 15, с. 306; 20, с. 97; 22, с. 257]. У залежнасці ад таго, якімі крытэрыямі ацэнкі падзей карыстаюцца аўтары, ужываецца адзін з прадстаўленых вышэй варыянтаў.

Дастаткова важным пытаннем заяўленай тэмы застаецца перыядызацыя падзей. Беларускія даследчыкі А. Э. Сакольчык (Фірыновіч) [14, с. 46; 15, с. 301, 306; 18, с. 185–187], В. В. Швед [20, с. 97], С. Я. Глазырын [3, с. 35], А. Л. Радзюк [11, с. 110–114, 117–120] у сваіх публікацыях прытрымліваюцца храналагічных рамак 1861–1862 гг. Але некаторыя замежныя гісторыкі, напрыклад польскі аўтар С. Ланец, вылучаюць апошнюю дату як асобны этап паўстанцкага руху – перыяд канспірацыйнай дзейнасці [29, s. 28–33; 30, s. 39; 31, s. 15; 32, s. 31–32]. Па ўспамінах аднаго з кіраўнікоў паўстання на беларуска-літоўскіх землях Я. Гейштара, перыяд з мая па снежань 1862 г. увогуле характарызаваўся як «зацішша перад бурай» [25, s. 162]. Але варта падкрэсліць, па-першае, што такая сітуацыя склалася ў сувязі з планамі паўстанцкіх арганізацый аддаць перавагу падпольнай барацьбе, якая была накіравана на падрыхтоўку да ўзброенага выступлення 1863–1864 гг. Па-другое, крыніцы паказваюць, што на працягу 1862 гг. на тэрыторыях беларуска-літоўскіх губерняў працягвалі ладзіцца палітычныя маніфестацыі ў рымска-каталіцкіх касцёлах, актыўна распаўсюджваўся падпольны паўстанцкі друк [12, с. 472–473, 475, 477–478, 548–550, 591, 610–611].

Паўнавартаснае асвятленне маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. патрабуе звароту асаблівай увагі на сацыяльна-колькасны склад удзельнікаў хваляванняў. Менавіта гэта пытанне не было паўнавартасна раскрыта ў сучаснай гістарычнай навуцы. Так, спецыялісты адзначаюць, што інтэлігенцыя, дваранства, студэнты, гімназісты, чыноўнікі, рымска-каталіцкае святарства, рамеснікі сталі сацыяльнай базай пратэстаў [7, с. 10; 15, с. 302; 18, с. 185]. Гісторык А. Э. Сакольчык (Фірыновіч) падкрэслівае асаблівую ролю жанчын у выступленнях [15 302–309]. Падобная выснова прысутнічаюць і ў мемуарах сучаснікаў падзей В. Кошчыца [27, s. 195], С. Кавалеўскай [28, s. 91].

Што датычыцца колькаснага складу ўдзельнікаў пратэстаў, то сучасныя беларускія даследчыкі прыводзяць некаторыя лічбы. Паводле гісторыка С. Я. Глазырына, у 1861 г. у Віцебскай губерні колькасць удзельнікаў масавых маніфестацый вагалася ад 100 да 600 чалавек [3, с. 35]. З 12 чэрвеня па 25 лістапада 1861 г., як адзначае даследчык А. Л. Радзюк, у антыўрадавых здарэннях у Гродне было заўважана 610 асоб [11, с. 120–138]. Варта канстатаваць, што прыведзены толькі асобныя лічбы, якія не могуць цалкам адлюстраваць агульнай карціны колькаснага складу ўдзельнікаў маніфестацый 1861–1862 гг. Паказальны прыклад: па звестках, якімі валодаў расійскі чыноўніцкі апарат, у ліпені 1861 г. у масавых антыўрадавых маніфестацыях у ваколіцах Гродна ўдзельнічала каля 3000 чалавек [12, с. 445–446].

Сацыяльна-колькасны склад актывістаў антыўрадавых выступленняў пачатку 60-х гг. XIX ст. вывучаў савецкі даследчык В. М. Зайцаў [4, с. 98–194]. Але ў яго грунтоўнай працы ў большай ступені прыводзяцца даныя перыяду ўзброенай барацьбы 1863–1864 гг. Гісторык А. Ф. Смірноў падае звесткі, паводле якіх агульная колькасць пакараных за антыўрадавыя хваляванні 1861–1862 гг. на тэрыторыі Беларусі і Літвы склала каля 300 чалавек [16, с. 65]. Але і апошні падыход не прэтэндуе на абагульненне.

З гэтага вынікае, што вызначэнне агульнай колькасці ўдзельнікаў маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. мае пэўную спецыфіку з прычыны выбару методыкі падлікаў. У афіцыйных дакументах і ўспамінах сучаснікаў пераважна адзначаецца сацыяльнае паходжанне маніфестантаў, а колькасныя паказчыкі падаваліся дастаткова агульна. Калі ўлічваць толькі актывістаў вулічных акцый пратэстаў, то такія статыстычныя даныя будуць утрымліваць значныя хібнасці, бо антыўрадавыя хваляванні мелі разнастайныя формы, а таму неабходна аналізаваць кожную асобную групу ўдзельнікаў. Для комплекснага даследавання пытання дарэчным

бачыцца выпрацоўка дакладных крытэрыяў падліку, а таксама прымяненне разнастайных матэматычна-статыстычных метадаў апрацоўкі вялікага масіву архіўных крыніц.

Перспектыўным для вывучэння з'яўляецца рэгіянальная спецыфіка беларускіх губерняў падчас грамадскіх хваляванняў 1861–1862 гг., якая, нягледзячы на значны ўплыў польскага руху, мела свае адметнасці. Так, даследчыца А. Э. Сакольчык (Фірыновіч), разглядаючы гісторыю аднаго з самых папулярных гімнаў маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. «Boża, coś Polskę» («Божа, які Польшчу…»), звяртае ўвагу на варыятыўнасць тэксту твора. Так, у беларуска-літоўскіх губернях існавала яго версія, у якой падкрэсліваўся значны ўнёсак мясцовых жыхароў у справу ўмацавання Рэчы Паспалітай. Больш за тое, гэты гімн быў надрукаваны беларускай лацінкай [14, с. 49; 13, с. 228]. Варта адзначыць, што выкананне рэлігійных песень і патрыятычных гімнаў, а таксама распаўсюджванне антыўрадавай літаратуры сталі даволі распаўсюджанымі формамі пратэстаў падчас маніфестацыйнага перыяду.

Таксама варта адзначыць наяўнасць выразнай рэгіянальнай адметнасці ў выкарыстанні патрыятычнай эмблематыкі, якая актыўна прымянялася прыхільнікамі антыўрадавага руху. Калі на землях былой Рэчы Паспалітай фіксавалася распаўсюджванне выяў Чанстахоўскай Маці Божай, то, паводле даследчыка В. С. Касмылёва, у беларуска-літоўскіх губернях было пашырана выкарыстанне выявы Вострабрамскай Маці Божай [6, с. 53]. Рэгіянальная спецыфіка беларускіх губерняў падчас маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. мае патэнцыял для далейшага вывучэння. Асабліва гэта датычыцца лакальных здарэнняў, якія адлюстраваны ў дакументах афіцыйнага справаводства і крыніцах прыватнага паходжання.

Такім чынам, аналіз праблемных пытанняў маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. паказаў яго актуальнасць для сучаснай беларускай гістарыяграфіі. У працах айчынных спецыялістаў адлюстраваны разнастайныя формы грамадскіх пратэстаў, сацыяльны склад удзельнікаў хваляванняў, прыведзены прыклады рэзанансных здарэнняў. Глыбокага даследавання патрабуе дзейнасць тайных паўстанцкіх арганізацый, колькасны склад удзельнікаў антыўрадавых акцый, рэгіянальная спецыфіка маніфестацый. Відавочна, што для вырашэння ўсіх праблемных момантаў, якія стаяць перад сучаснай айчыннай гістарычнай навукай у рэчышчы заяўленай тэмы, неабходна арганізаваць правядзенне грунтоўнага вывучэння вялікага масіву архіўных дакументаў і крыніц

прыватнага паходжання. Перспектыўным бачыцца падрыхтоўка асобнай навуковай працы, у якой варта комплексна прааналізаваць маніфестацыйны перыяд 1861–1862 гг. на тэрыторыі беларускіх губерняў.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Герасімчык В. У. Канстанцін Каліноўскі: асоба і легенда. Мінск: ТАА ЮрСаПрынт, 2018.
2. Глазырын С. Я. Паўстанне 1863 года ў Віцебскай і Магілёўскай губернях: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: Ін-т гісторыі НАН Беларусі. Мінск, 2017.
3. Глазырын С. Я. Рэвалюцыйная сітуацыя 1861–1862 гадоў у Віцебскай губерні // Вестн. Полоц. гос. ун-та. 2010. № 7. С. 35–41.
4. Зайцев В. М. Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (Опыт статистического анализа). М.: Наука, 1973.
5. Ігнатоўскі У. М. 1863 год на Беларусі: нарыс падзей. Мінск: Беларус. Акад. навук., 1930.
6. Касмылёў В. С. Польская эмблематыка ў грамадска-палітычным руху на Беларусі ў пачатку 60-х гг. XIX ст. // Беларус. гіст. часоп. 1993. № 3. С. 51–53.
7. Матвейчык Д. Ч. Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў. Мінск: Медысонт, 2013.
8. Миско М. В. Польское восстание 1863 года. М.: Изд-во АН СССР, 1962.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 320. Воп. 3. Спр. 129.
10. НГАБ. Ф. 320. Воп. 3. Спр. 132.
11. Радзюк А. Л. Гарадзенскі супраціў 1861 г. // Гарадзенскі соцыум, 2013. Гісторыя і памяць. XV–XX стст.: матэрыялы міжнар. навук. канф. (Гародня, 9–10 лістапада 2013 г.). / [пад рэд. А. К. Краўцэвіча, А. Ф. Смаленчука]. Гародня [Гродна], 2014. С. 110–139.
12. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.: материалы и документы. М.: Наука, 1964.
13. Сакольчык А. Э. З гісторыі адной песні... Рэлігійна-патрыятычны гімн 1860-х гг. // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф. (20–21 лістапада 2014 года, г. Мінск) / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; уклад. Ю. В. Пацюпа; гал. рэд. А. І. Лакотка. Мінск: Права і эканоміка, 2014. С. 227–229.
14. Сакольчык А. Э. «Нядобранадзейная» Рэчыца і яе жыхары ў часы паўстання 1863–1864 гадоў // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зб. навук. арт. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. 2015. Вып. 4. С. 46–51.
15. Сакольчык А. Э. Пратэстная актыўнасць грамадства напярэдадні і падчас паўстання 1863–1864 гг. // Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. Мінск: Беларус. навука, 2018. С. 301–321.
16. Смирнов А. Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. М.: АН СССР, 1963.
17. Смирнов А. Ф. Манифестационное движение в Белоруссии и Литве 1861 г. // Революционная ситуация в России 1859–1861 гг. сб. ст. / Ин-т истории АН СССР ; ред. кол.: акад. М. В. Нечкина (отв. ред.) и др. М.: Наука, 1960. С. 460–480.
18. Фірыновіч А. Э. Маніфестацыйны перыяд паўстання 1863–1864 гг. у беларуска-літоўскіх губернях // Шлях да ўзаемнасці (Гродна, 18–19 ліст. 2010 г.): матэрыялы міжнар. навук. канф. / Гродз. дзярж. ун-т імя Я. Купалы; рэдкал.: Г. Хацкевіч, Я.

Панькоў, Э. Ярмусік, І. Папоў (гал. рэдактары) [і інш.]. Гродна: ГрДУ, 2011. С. 184–187.
19. Цытовіч С. Г. 1863 год у Горы-Горках быўшай Магілеўскай губэрні (падзеі паўстаньня) // Arche. 2015. №3. С. 363–540.
20. Швед В. В. Перадпаўстанцкі рух у Гродзенскай губерні ў 1861–1862 гадах // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Гродна, 2014. Вып. 8. С. 78–97.
21. Швед В. В. Чыноўнікі – сябры Гарадзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі 1861–1864 гг. // Гарадзенскі соцыум, 2013. Гісторыя і памяць. XV–XX стст.: матэрыялы міжнар. навук. канф. (Гародня, 9–10 лістапада 2013 г.) / пад. рэд. А. К. Краўцэвіча, А. Ф. Смалянчука. Гародня [Гродна], 2014. С. 140–152.
22. Яноўская В. В. Каталіцкае духавенства ў пратэстных акцыях напярэдадні паўстання 1863–1864 гг. // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі ; уклад.: В. В. Яноўская, А. У. Унучак, А. Э. Фірыновіч; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск: Беларус. навука, 2014. С. 256–266.
23. Dubiecki M. Powstanie styczniowe. Kraków: Nakładem Krakowskiej Spółki Wydawniczej, 1924.
24. Fajnhauz D. 1863: Litwa i Bialorus. Warszawa: Neriton, 1999.
25. Gieysztor J. Pamiętniki Jakóba Gieysztora z lat 1857–1865: w 2 t. T. 2. Wilno: Nakladem Tow. Udz. «Kurier Litewski», 1913.
26. Kieniewicz S. Powstanie styczniowe. Warszawa: Krajowa Agencja Wydawnicza RSW «Prasa-Książka-Ruch», 1987.
27. Koszczyc W. Wspommenia z powstania województwa Minskego w roku 1863. «Polska w walce». t. II. Krakow, 1875. S. 196–202.
28. Kowalewska Z. Obrazki mińskie, 1850–1863. W Wilnie: Nakład Księgarni Józefa Zawadzkiego, 1912.
29. Łaniec S. Białoruś w drugiej połowie XIX stulecia. Olsztyn: Wydawnictwo WSP, 1997.
30. Łaniec S. Litwa i Białoruś w dobie konspiracji i powstania zbrojnego (1861–1864). Olsztyn: OBN im. W. Kętrzyńskiego, 2002.
31. Łaniec S. Partyzanci Kresów Północno-Wschodnich w powstaniu styczniowym: (ziemie białoruskie). Toruń: Top Kurier, 1996.
32. Łaniec S. Ziemie białoruskie w latach reformy agrarnej, manifestacji patriotycznych i konspiracji narodowej (1860–1862). Toruń: Top Kurier, 1998.